5. Нікановіч, Д. А. Газетны кантэнт ва ўмовах трансфармацыі нацыянальнай медыясферы: адаптацыя і мадэляванне: аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук: 10.01.10 / Д. А. Нікановіч; БДУ. – Мінск, 2019. – 26 с.
6. Самусевіч, В. Рэгіянальныя медыя Беларусі: сацыяльная місія, праблемы і перспектывы / В. Самусевіч // Рэгіянальныя СМІ Рэспублікі Беларусь у лічбавую эпоху: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 12–13 лют. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В. М. Самусевіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2019. – С. 208–212.

УДК 655.28.022.8

А. В. Варанецкая, магістрант (БДТУ, Мінск)

# ПРЫЧЫНЫ ЎЗНІКНЕННЯ ПАМЫЛАК ПРЫ ПЕРАДАЧЫ *Ў* (НЕСКЛАДОВАГА) І *У* (СКЛАДОВАГА) У ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫМ ТЭКСЦЕ

Парушэнні беларускага правапісу адмоўна адбіваюцца на культуры мовы публіцыстычнага тэксту, паколькі яны ўскладняюць яго разуменне, прыводзяць да агульнай непісьменнасці і фарміруюць недакладныя арфаграфічныя і граматычныя кампетэнцыі ў чытача. Сучасны рэдактар павінен надаваць асаблівую ўвагу аналізу памылак, так як веданне прычын і іх прыроды можа папярэдзіць іх узнікненне.

Напісанне ***ў*** (нескладовага), як і ***у*** (складовага), заснавана ў асноўным на фанетычным прынцыпе беларускай арфаграфіі. Таму з першага погляду здаецца, што з гэтым правілам не можа ўзнікаць цяжкасцей, але ж на практыцы атрымліваецца зусім інакш.

Задача даследавання – выявіць памылкі пры перадачы ***ў*** (нескладовага) і ***у*** (складовага) у публіцыстычных тэкстах перыядычных выданняў і ўсталяваць прычыны іх узнікнення. Матэрыяламі для даследавання паслужылі беларускамоўныя публікацыі, размешчаныя на сайтах выданняў «Звязда», «Культура», «Наша Ніва» і «Новы час» за 2018–2020 гг.

Прычыны памылак у тэкстах сучасных СМІ наступныя:

1. Недастатковае веданне новай рэдакцыі Правіл беларускай арфаграфіі. *Футбалісты брэсцкага «Дынама» прабіліся ў трэці кваліфікацыйны* ***раунд*** *Лігі чэмпіёнаў* («Звязда»). Норма – *раўнд*. *Нарэшце, на цокальным паверсе –* ***сауна*** *з пакоем адпачынку, більярд і кацельня* («Наша Ніва»). Норма – *саўна*.

2. Найбольш распаўсюджаная прычына – няўважлівасць. *Патрабавальнасць Мулявіна да сябе пераходзіла* ***усякія*** *межы* («Наша Ніва»); *Калі ўважліва ўгледзецца ў творы экспазіцыі выставы, дык здолееш*

*праз выявы на карцінах і графічных аркушах,..., адчуць гэты працэс **узаемаўздзеяння**…* («Культура»); *ВКЛ, якое ў верасні 1557 года падпісала з Лівонскім ордэнам дамову аб **ўзаемнай** абароне…* («Культура»); *Кожны вучэбны прадмет аказвае ўплыў на фарміраванне дзяцей і моладзі, але найбольш істотна, безумоўна, **ўплываюць** сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны…* («Звязда»).

3. Неведанне слова-выключэння «траур» з правіла пастаноўкі ***ў*** пасля галосных. *У Адэскай вобласці аб'яўлены_**траўр** па ахвярах пажара ў гатэлі…*(«Звязда»); *З фармальнага боку людзі, што сабраліся падчас чумы і сцвярджаюць: іх прыватныя перажыванні больш важныя, чым агульнанацыянальны **траўр*** («Новы час»).

4. Прыняцце двукосся за знак прыпынку. *Кандыдатура Ігара Ляшэнкі, які зараз узначальвае прадстаўніцтва ААТ «Гомельстранснафта Дружба» **у** Мінску, узгодненая на пасаду генеральнага дырэктара ААТ «Гродна Азот»* («Звязда»).

5. Распаўсюджванне дзеяння правіла чаргавання ***в*** з ***ў*** пасля галосных на ўласныя назвы неславянскага паходжання. *Такім чынам, цяпер сігнал нашага міжнароднага тэлеканала будзе даступны з трох спадарожнікаў – ABS-2A (Расія, краіны СНД і Балтыі), HotBird (Еўропа, Бліжні Усход і Паўночная Афрыка), «AsiaSat 5» (Аўстралія, Новая Зеландыя, Японія, Кітай, Паўночная і Паўднёвая Карэя, Індыя, **Уетнам** і іншыя краіны Паўднёва-Усходняй Азіі)* («Звязда»). Норма – *В’етнам*.

6. Ігнараванне з’явы пабочнага націску. *Кітайскія даследчыкі паспяхова стварылі новы **ўльтрагукавы** эндаскапічны мікразонд для дыягностыкі паталагічных змяненняў страававальнаг…* («Звязда»). Норма – *ультрагукавы*.

7. Падпарадкаванне фанетычнаму прынцыпу замест марфалагічнага ў словах, утвораных ад тых, дзе гук [**у**] знаходзіцца пад націскам. *Бо на кавалку беларускай зямлі сышліся чатыры даволі значныя канфесіі – каталікі, праваслаўныя, мусульмане і **іўдзеі*** («Звязда»). Норма – *іудзеі*.

8. Распаўсюджванне дзеяння фанетычнага прынцыпу на канцы нязменных запазычаных слоў з традыцыйным прынцыпам напісання. *Яны стануць удзельнікамі **ток-шоў** «Дыялог», у якім паспрабуюць знайсці вырашэнне існуючых праблем у галіне бяспекі жыццядзейнасці* («Звязда»). Норма – *ток-шоу*. *Смарт-сканар запушчаны ў Беларусі ўпершыню, хоць гэта і не наша **ноў-хаў**…* («Звязда»). Норма – *ноу-хау*. *«Такім жа быў у 2010 годзе фільм «Жалезам па шклу», а ў 2017 годзе мы бачылі сюжэт пра ліст ад **фраў** А. і «Белы легіён», у якім*

*дэманстраваліся аўтаматы ў багажніках аўтамабіляў, гранаты («Наша Ніва»). Норма – фрау.*

9. Захаванне традыцыйнага напісання пры ўтварэнні новага слова ад запазычаных з канцавым ***у***, якое закрывае склад. *Дыктар «Барысаў-Арэны», **шоумен**, радыёвядучы Канстанцін Каверын падзяліўся меркаваннем пра Віктара Бабарыку, які плануе балаціравацца на пасаду прэзідэнта Беларусі* («Наша Ніва»); *Вядучым свята быў **шоумен** Яўген Булка* («Новы час»). Норма – шоўмен. Норма – *шоўмен*.

10. Распаўсюджванне дзеяння фанетычнага прынцыпу на запазычаныя словы, якія заканчваюцца на ***-ум***, ***-ус***. *Кажа, што на гэтай пляцоўцы людзі з машынамі шашлыкі рабілі, таму давялося ставіць **шлагбаўм*** («Наша Ніва»). Норма – *шлагбаум*. *Ёсць у асартыменце і нямала відаў прадукцыі з перапрацаваных таматаў – гэта і **соўс**, і паста…* («Звязда»). Норма – *соус*. *Усходняя Еўропа аказалася радзімай сучасных **страўсаў*** («Новы час»). Норма – *страус*.

Адолець акрэсленыя прычыны анарматываў магчыма пры дапамозе высокага ўзроўню пісьменнасці працаўнікоў СМІ, зладжанага працэсу падрыхтоўкі якаснай публіцыстыкі, сумленнага самааналізу і самакарэкцыі ўласнага прафесійнага досведу тымі, хто піша і рэдагуе матэрыялы.

УДК 655.267.25-053.2.5

Д.П. Зылевіч, канд. філ. навук, дац. (БДТУ, г. Мінск)

## КРЭАТЫЎНЫЯ ГРАФІЧНЫЯ МАДЭЛІ СУЧАСНЫХ БЕЛАРУСКІХ ВЫДАННЯЎ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Рэпертуар беларускіх сучасных выданняў для дзяцей дэманструе як разнастайнасць тэматычнай накіраванасці, так і крэатыўныя падыходы аўтараў і выдаўцоў да праектавання выданняў. Мэта даследавання – выявіць і прааналізаваць кнігі з цікавай формай. Аб’ект – літаратурна-мастацкія выданні, падрыхтаваныя беларускімі выдавецтвамі з 2015 па 2020 гг.

У першую чаргу адзначым наяўнасць выданняў з дапоўненай рэальнасцю, што збліжае кнігу і інтэрнэт і вельмі падабаецца дзецям. Такія выданні прапануюць выдавецтвы “Адукацыя і выхаванне”, “Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі”, “Беларусь”.

Сярод папяровых выданняў з’явіліся кніжкі-кардонкі, кніжкі-перакруткі, кнігі-квэсты, кнігі, афармленне якіх нагадвае экран планшэта ці смартфона. Арыгінальнай канцэпцыяй у плане праектавання адзначаецца, напрыклад, перакладная кніга “Вельмі